5. *Тульчинский Г.Л.* Public relations: репутация, влияние, связи с прессой и общественностью, спонсорство. – СПб.: Лань, 2001. – 80 с.
6. *Частная* благотворительность на Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. // Социально-педагогическая работа.– 1997. – № 1. – С. 63–73.
7. *Черникова В.В.* Регулирование деятельности благотворительных организаций Великобритании: историко-правовые аспекты // Государство и право. – 1999. – № 8. – С. 102–104.

*А.В.Рабава*

## АРГАНІЗАЦЫЯ СУМЕСНАГА АДПАЧЫНКУ БАЦЬКОЎ І ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ ТУРЫЗМУ

Са старажытных часоў сям'я ўспрымалася як аснова матэрыяльнага і духоўнага дабрабыту чалавека, пераемнасці пакаленняў, добрага ладу жыцця, што знайшло адлюстраванне ў шматлікіх прымаўках, напрыклад, "Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын", "Як бацькі жылі, так і нам наказвалі жыць" і інш.

Сацыёлагі, псіхолагі, педагогі вызначаюць шэраг цяжкасцей сацыяльна-эканамічнага, псіхолага-педагагічнага, маральнага кшталту, якія перажывае сучасная сям'я. Зніжэнне трываласці сям'і як сацыяльнага інстытута суправаджаецца ўнутранай нестабільнасцю, канфліктамі, дэзарганізацыяй сямейных адносін, скасаваннем шлюбу, узаемным адчужэннем дзяцей і бацькоў. Аўтаномія членаў сямейнай групы ўзмацняецца ўдзелам дарослых у грамадскай вытворчасці і іх заклапочанасцю яго працэсам і вынікамі. Гэта не толькі змяншае колькасць часу, які праводзіцца з сям'ёй, але больш значнымі і істотнымі робіць пазасямейныя сферы самавызначэння, такія як асабістыя поспехі ў працы, павышэнне кваліфікацыі, самасцвярджэнне ў групе калег і інш. Усё гэта, а таксама ранняя сацыялізацыя дзіцяці, знаходжанне яго ў дашкольных і школьных установах прывялі да абмежавання сям'і, дзе сталі пераважаць гаспадарча-бытавыя функцыі бацькоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але ж сямейнае жыццё – гэта значная частка ўсяго чалавечага жыцця, якая ўключае не толькі працу па абслугоўванні сябе і дзяцей. Сям'я мае вялікі выхаваўчы, эмацыянальны, духоўны патэнцыял. Адной з умоў рэалізацыі багатага выхаваўчага патэнцыялу сям'і з'яўляецца сумесная дзейнасць бацькоў і дзяцей.

Фундаментальным даследаванням розных відаў дзейнасці, якія спрыяюць развіццю асобы, фарміруюць яе актыўнасць, самастойнасць, адказнасць, інтарэсы, а таксама вызначаюць сістэму яе ўзаемаадносін з іншымі людзьмі ў сумеснай дзейнасці, прысвечаны шэраг прац айчынных псіхолагаў і педагогаў (Я.Л.Каламінскага, В.М.Наумчыка, В.У.Чэчата і інш.).

Але менавіта ўдзелу ўсіх членаў сямейнай групы ў сумеснай дзейнасці і не хапае сучаснай сям'і, асабліва гарадской, што прыводзіць у большасці выпадкаў да ўзаемнага адчужэння паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі.

Рэальныя магчымасці для пераадолення адчужэння ў сям'і мае сфера вольнага часу, у якой прысутнічаюць неабходныя ўмовы для карыснага і разнастайнага ўзаемадзеяння яе членаў у працэсе заняткаў агульнай справай. Інтэнсіўнае запаўненне вольнага часу рознымі формамі культурна-адпачынкавай дзейнасці здольнае даць значныя вынікі як у падтрымцы і замацаванні сямейных адносін, так і ў пераадоленні аўтаноміі і раз'яднанасці дзяцей і бацькоў.

Вольны час дае чалавеку магчымасць разнастайнага выбару зместу і формаў для сумеснай дзейнасці з іншымі, што садзейнічае аб'яднанню членаў сям'і.

Аднак у рэальным жыцці мы сустракаемся са шматлікімі цяжкасцямі пры арганізацыі сумеснай адпачынкавай дзейнасці бацькоў і дзяцей. Такое становішча складаецца па шэрагу прычын, як, напрыклад:

– адсутнасць вопыту адпачынкавага ўзаемадзеяння ў сям'і, няўменне членаў сям'і праводзіць вольны час разам;

– аднастайнасць формаў зносін дзяцей і дарослых, пабудаваных на адносінах залежнасці, і адсутнасць жадання змяніць гэтыя адносіны;

– непрыманне бацькамі інтарэсаў, захапленняў, адпачын-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кавых схільнасцей дзяцей і наадварот;

– імкненне дзяцей, асабліва падлеткаў, да правядзення адпачынку ў групе аднагодкаў, адсутнасць цікавасці да малазмястоўнага, аднастайнага, часцей за ўсё пасіўнага, адпачынку бацькоў;

– перавага ў сям'і звычаяў асобна праводзіць вольны час з мэтай адпачыць адзін ад аднаго і ад сямейных праблем.

Адной з больш чым 480 формаў адпачынкавай дзейнасці, здольнай пераадолець названыя праблемы арганізацыі сямейнага адпачынку і ўнутрысямейнай камунікацыі, з'яўляецца, на наш погляд, сямейны турызм, патэнцыял якога выкарыстоўваецца сёння недастаткова. Так, сярод нерэалізаваных запатрабаванняў у адпачынкавай дзейнасці юнакоў турызм складае 48 %, дзяўчат – 72 % [1, с. 15]. У апошняе дзесяцігоддзе назіраецца таксама рост перавагі турызму як віду дзейнасці падчас адпачынку дарослых.

Сямейны турызм адкрывае вялікія выхаваўчыя магчымасці. Разумнае комплекснае выкарыстанне прыродных фактараў, змена становішча і ўражанняў у час турпаходу, падарожжа, экскурсіі станоўча ўплываюць на здароўе і настрой дзяцей і дарослых. Сямейны турызм садзейнічае аб'ядна-насці, умацаванню сям'і, дае магчымасць бацькам кампенсаваць вымушаны недахоп увагі да дзяцей.

Сямейны турызм, па меркаванні А.Летавінай, з'яўляецца формай блізкіх узаемадачыненняў членаў сям'і ў вольны час, "паколькі асаблівая функцыя турысцкай дзейнасці – гэта рэгуляванне сямейна-шлюбных адносін, менавіта складанне ўмоў для паспяховага выхавання дзяцей у сям'і, зносін усіх членаў сямейнай групы, іх узаемаразумення" [2, с. 22].

Паколькі турысцкая дзейнасць уключае розныя формы і віды турызму (паходы, экскурсіі, падарожжы на веласіпедах, аўтамабілях і інш.), яна дазваляе ўлічваць інтарэсы ўсіх членаў сямейнай групы, кампенсаваць адсутнасць вопыту адпачынкавага ўзаемадзеяння ў сям'і, пазбегнуць аднастайнасці і пасіўнага правядзення адпачынку, зрабіць яго поліварыянтным.

У цяперашні час у Беларусі, як і ў цэлым у Еўропе, расце папулярнасць пазнавальнага турызму, які разглядаецца як сродак дадатковай адукацыі для дарослых. Падарожжа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становіцца не проста перамяшчэннем па краіне ці за яе межамі. Гэта і сапраўдная адукацыйная работа. Вучэбная дзейнасць, якая з'яўляецца вядучай у дзяцей школьнага ўзросту, выступае фактарам збліжэння інтарэсаў дзяцей і бацькоў у сферы адпачынку. Прычым у сумеснай пазнавальнай дзейнасці ў турызме дарослыя і дзеці ўспрымаюцца як роўныя. Таму сямейны турызм садзейнічае пераадоленню аднастайных формаў зносін дзяцей і дарослых, пабудаваных на адносінах залежнасці.

Часцей за ўсё дзеці, асабліва падлеткі, больш удзельнічаюць у турысцкай справе, чым бацькі, таму што турызм набывае вялікую папулярнасць як форма пазакласнай работы школы. Дзеці ахвотна прымаюць удзел у планаванні падарожжаў для ўсёй сям'і, выкарыстоўваючы асабісты вопыт, які атрымліваюць у пазакласнай рабоце ў школе.

У выніку апытання сямейных груп, якія ад'язджаюць на адпачынак у г.Кракаў (Польшча), намі вызначана, што большасць сямей (14 з 18) выбралі гэтае падарожжа на падставе асабістых уражанняў дзяцей і іх равеснікаў пасля арганізаванай у школе экскурсіі ў Кракаў з наведваннем аквапарку. (Апытанне праводзілася сярод бацькоў вучняў СШ № 159 г. Мінска.)

Яшчэ на этапе падрыхтоўкі будучага сумеснага адпачынку аптымізуюцца адносіны ўнутры сямейнай групы. Дзеці, асабліва падлеткі, могуць быць не толькі паўнапраўнымі ўдзельнікамі адпачынкавага ўзаемадзеяння ў сям'і, але і ініцыятарамі турысцкіх формаў сумеснага з бацькамі праводзення вольнага часу, што перамяшчае іх з пазіцыі "другарадных" у выбары і арганізацыі тых ці іншых спосабаў адпачынкавай дзейнасці на пазіцыю "вядучых". У цэлым фарміраванне партнёрскіх адносін паміж дзецьмі і бацькамі ў сумеснай турысцкай дзейнасці вядзе не толькі да прадухілення канфліктных сітуацый, але і да пераадолення псіхалагічных парушэнняў асобы падлеткаў, інфантылізму, непадрыхтаванасці да ролі дарослага.

Каштоўнай якасцю турысцкай дзейнасці з'яўляецца магчымасць выкарыстання яе як эфектыўнага сродку вывучэння дзяцей, дыягностыкі іх адхіленняў у духоўным развіцці, пазнання дзецьмі адзін аднаго, самапазнання, а таксама пазнан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня бацькамі дзяцей. “Паходы з бацькамі дзяцей, калі бацькі не толькі знаёмяцца з турысцка-краязнаўчымі ведамі і навыкамі, якія набылі іх дзеці, але ў параўнанні сваіх дзяцей з іншымі атрымліваюць больш поўнае ўяўленне пра сваё дзіця, – вельмі карысная справа”, – па меркаванні А.Астапца [3, с. 98].

З'яўляючыся формай сямейнага правядзення вольнага часу, турызм дазваляе рацыянальна выкарыстоўваць не толькі водпуск ці канікулы, але і выхадныя дні, што таксама важна, таму што сёння, па словах В.Квартальнага, можна адзначыць “недаразвітасць структуры арганізаваных формаў кароткатэрміновага адпачынку, якая становіцца прычынай запаўнення вольнага часу членаў сямейнай групы негатыўнымі і асацыяльнымі спосабамі правядзення адпачынку: п'янствам, наркаманіяй, гультайствам” [4, с. 10].

У Беларусі налічваецца каля 500 турпрадпрыемстваў, большасць з якіх прапануе сямейны адпачынак. Разам з гэтым відавочна, што сям'я мае патрэбу ў прафесійнай дапамозе спецыялістаў, якія здольныя раскрыць перад дарослымі аб'ектыўныя магчымасці сумеснай турысцкай дзейнасці ў забеспячэнні духоўнага, эмацыянальнага, інтэлектуальнага адзінства сям'і, стварыць умовы для творчай дзейнасці, для развіцця асабістых якасцей і бацькоў, і дзяцей, сфарміраваць і развіць неабходныя навыкі і ўменні іх адпачынкавага ўзаемадзеяння, знайсці найбольш дакладныя спосабы і формы такога ўзаемадзеяння ў адпаведнасці з асаблівасцямі кожнай сям'і. Пастаўленыя задачы здольны вырашаць сацыяльны педагог, які спецыялізуецца на праблемах арганізацыі сямейнага адпачынку і валодае разнастайнымі метадамі работы з сям'ёй. У дадзеным выпадку дарэчы звярнуцца да практыкі арганізацыі турысцкай дзейнасці ў былым СССР. Функцыянавала сістэма прыёму турыстаў з дзецьмі, якая ўключала, акрамя турбаз, гасцініц, комплексныя праграмы работы з дзецьмі, сям'ёй, рэалізацыяй якіх займаўся штат супрацоўнікаў – выхавацеляў, арганізатараў адпачынку, інструктараў турызму. Цікава, што ў сучасных вучэбных дапаможніках па маркетынгу ў турызме ў якасці сродку пашырэння турысцкіх паслуг ва ўмовах канкурэнцыі турпрадпраемствам рэкамендуецца даць нейкую унікальную прапа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нову, якая можа ўключаць, напрыклад, такую паслугу для сямейных турыстаў, як догляд за дзецьмі.

На нашу думку, калі ўлічваць нерэалізаваны патэнцыял сямейнага турызму ў аптымізацыі ўнутрысямейных адносін, сфера турызму патрабуе псіхолага-педагагічнага суправаджэння, якое могуць ажыццяўляць сацыяльныя педагогі. Аднак гэта праблема патрабуе самастойнага даследавання.

1. *Монастырский Д.В.* Взаимодействие учреждений культуры и кинопроката при организации досуга молодёжи: Автореф. дис. … канд. пед. наук. – М., 1999. – 21 с.

2. *Летавина Е.И.* Семейный туризм – одна из форм полноценного общения семьи в свободное время // Развитие самодеятельного туризма как фактора организации свободного времени населения: Тез. Всесоюзн. науч.-практ. конф. – М., 1988. – 257 с.

3. *Остапец А.А.* Педагогика туристско-краеведческой работы в школе. – М.: Педагогика, 1985. – 178 с.

4. *Квартальнов В.А.* Туризм, экскурсия, обмен: современная практика. – М.: Наука, 1993. – 203 с.

*В.У.Рагачова*

## ПРЫНЦЫПЫ АРГАНІЗАЦЫІ КАРЭКЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Карэнныя змены ў палітычным і эканамічным жыцці апошніх дзесяцігоддзяў выклікалі прынцыпова новае разуменне сутнасці культурна-адпачынкавай дзейнасці. Так, разам з агульнапрызнанымі функцыямі рэкрэацыі і развіцця [1] сёння важнай функцыяй гэтай дзейнасці з'яўляецца прафілактыка з'яў дэзадаптацыі, працы з дзецьмі, маючымі тыя або іншыя адхіленні ад нормы ў развіцці. Гэта, у сваю чаргу, патрабуе распрацоўкі прынцыпаў карэкцыйна-развіццёвай дзейнасці ва ўмовах арганізацыі і правядзення вольнага часу.

На наш погляд, адным з вядучых прынцыпаў арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ